*Г.В.Вахтомаў*

# ТРАДЫЦЫЙНАЯ РАДЗІННАЯ АБРАДНАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ

Традыцыйныя радзінныя звычаі і абрады беларусаў у пачатку XX ст. уяўлялі стройную сістэму, у якой знайшлі адлюстраванне разнастайныя бакі народнай культуры, быту, філасофіі, рэлігіі, светаўспрымання і светаасэнсавання. Вывучэнне традыцыйных радзінных звычаяў і абрадаў дае магчымасць зразумець лад жыцця беларускага селяніна, дзе галоўнымі каштоўнасцямі былі праца, сям'я, радзіма. Выконваючы прынятыя ў дадзенай мясцовасці абрады, звязаныя з нараджэннем дзіцяці, вяселлем і іншым, селянін верыў, што гэтым забяспечвае сабе і сваім блізкім шчасце, багацце, добры ўраджай. Веданне і дэталёвае выкананне традыцыйных абрадаў і нормаў паводзін стваралі канкрэтнаму чалавеку ці сям'і добрую славу, якая перадавалася з пакалення ў пакаленне і высока ацэньвалася грамадой.

Традыцыйная сістэма радзіннай абраднасці фарміравалася на працягу стагоддзяў, таму ў ёй можна сустрэць і універсальныя магічныя ўяўленні, і агульначалавечае асэнсаванне працэсаў зараджэння і канца жыцця, і сведчанні разумення нашымі продкамі цеснай сувязі паміж зямным жыццём і космасам, і рэлікты вераванняў у татэма – бусла. Добра захаваліся ў ёй культы продкаў, агню, вады, расліннасці.

Комплекс традыцыйных радзінных звычаяў і абрадаў у пачатку XX ст. складаўся з трох узаемадапаўняльных цыклаў: дародавага, родавага і пасляродавага. Абраднасць першага цыкла, куды ўваходзілі звычаі, вераванні, абрадавыя дзеянні, звязаныя з цяжарнасцю жанчыны, заснавана на ўсеагульным магічным уяўленні. У шэрагу забаронаў прасочваюцца рысы язычніцкіх вераванняў (цяжарным не дазвалялася глядзець на пажар, на нябожчыка, хадзіць на пахаванні, на могілкі), у некаторых – рэшткі ўяўленняў аб сувязі паміж чалавекам, раслінным і жывёльным светам (цяжарным не раілі трымаць або цягнуць за рогі цельную карову, бо роды будуць доўга цягнуцца; калі цяжарная прыйшла пазычаць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якую-небудзь рэч, трэба ёй даць тое, што яна просіць, бо ўсё роўна гэта рэч прападзе: “яе з’ядуць мышы”; каб пазбегнуць выкідыша, цяжарная з’ядала жменю жытняй мукі, перамешанай з вадою). Аналіз вераванняў і ўяўленняў, звязаных з цяжарнасцю жанчыны, дае магчымасць выявіць іх агульныя рысы ва ўсходнеславянскіх народаў.

Звычаі і абрады, звязаныя з нараджэннем дзіцяці, былі накіраваны на паспяховы зыход родаў. Паводле народнага меркавання, роды, з’яўленне на свет дзіцяці – загадкавыя і таямнічыя справы, таму, набліжаючыся да іх, прытрымліваліся ўсіх спрадвечных звычаяў і абрадаў. Звычайна пры родах карысталіся паслугамі вясковых бабак-павітух. Павітуха, як правіла, была жанчына сталага ўзросту, часцей за ўсё ўдава, якая сама ўжо перастала раджаць. Яна валодала працейшымі прыёмамі народнай медыцыны і выконвала акушэрскія функцыі. Разам з ёю да парадзіхі і нованароджанага запрашалі і другую, так званую прыёмную бабку, што перавязвала пупавіну і першы раз купала дзіця. Да парадзіхі звалі бабку-павітуху муж, свякроў ці іншая замужняя жанчына, але не дзяўчына. Павітуха імкнулася дапамагчы парадзісе ўсімі даступнымі ёй сродкамі (гэта і практычныя акушэрскія прыёмы, і магічныя дзеянні, заснаваныя на веры ў звышнатуральныя сілы). Звычаі і абрады беларусаў, звязаныя з названымі падзеямі, суаднясенне іх з аналагічнымі звычаямі і абрадамі ў іншых народаў сведчаць аб старадаўнасці іх паходжання. Сувязь пупавіны і плацэнты з чалавекам у шматлікіх народаў лічылася вельмі цеснай. Асноўны змест і значэнне абраду першага купання нованароджанага заключаліся ў непасрэдным гігіенічным ачышчэнні дзіцяці. Існавала разнастайная сістэма варожбы аб будучым лёсе дзіцяці ў залежнасці ад дня яго нараджэння. Паўсюдна ў Беларусі жанчыны выконвалі разнастайныя забароны і правілы паводзін, каб у іх было малако для кармлення дзіцяці. У адпаведнасці з традыцыяй мэтазгодна карміць дзіця малаком маці да двух–трох гадоў.

Пасляродавы цыкл традыцыйнага радзіннага комплексу ў асноўным сімвалізаваў прыняцце нованароджанага ў сям’ю і грамадства і ўключаў абрады наведвання парадзіхі і новона-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

роджанага, выбару кумоў, а таксама святкавання хрэсьбін, ачышчэння і інш.

Традыцыйная радзінная абраднасць беларусаў у пачатку XX ст. уяўляла цэласную сістэму, у якой былі свае законы, шматступенная іерархія, сімволіка. Згаданая сістэма мела беспамылковы механізм адбору і захавання найбольш каштоўнага з усяго таго, што стыхійна стваралі мастацтва, этыка, філасофія, медыцына.

Традыцыйная радзінная абраднасць існавала ў рамках іншай сістэмы, якая называлася “традыцыйны ўклад жыцця”, што быў характэрны для сельскай абшчыны беларускай вёскі ў пачатку XX ст. Сельская абшчына была носьбітам традыцыйнай народнай культуры. Традыцыйная радзінная абраднасць побач з іншымі формамі народнай культуры выконвала адпаведную ролю ў механізме ўзнаўлення беларускага этнасу: перадавала вопыт ад пакалення да пакалення, фарміравала і ўмацоўвала нацыянальную самасвядомасць.

На сённяшні дзень падсістэма радзінных звычаяў і абрадаў – дзе гвалтоўным, дзе натуральным шляхам – разбурана. Тыя разрозненыя, адасобленыя часткі некалі цэласнага радзіннага комплексу, што бытуюць зараз, амаль не адлюстроўваюць пераемнасці ў працэсе ўзнаўлення нацыянальных культурных каштоўнасцей, не выконваюць тых важных сацыяльных функцый, як у пачатку XX ст.

Радзінная абраднасць, як у цэлым уся традыцыйная народная абраднасць, зведала негатыўны ўплыў і вынікі партыйнай палітыкі, накіраванай на “сціранне нацыянальных адрозненняў”, што прывяло да глыбокага крызісу беларускай нацыянальнай культуры і наогул паграджала існаванню беларускага этнасу. Знікненне традыцыйнай народнай абраднасці таксама звязана са знішчэннем, а пазней са “здрабненнем” сялянства як класа. Адной з прычын заняпаду традыцыйнай абраднасці быў агульны нізкі культурны ўзровень, велізарны разрыў паміж штодзённым побытам, масавай культурай жыхароў рэспублікі, з аднаго боку, і здабыткамі беларускай нацыянальнай культуры, распрацаванай літаратарамі, навукоўцамі, мастакамі, з другой.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

На сённяшні дзень у радзіннай абраднасці захаваліся толькі дзве формы: народна-бытавая і царкоўная.

У цяперашні час традыцыйны радзінны комплекс не захаваў сваёй цэласнасці. Найбольшай трансфармацыі падвергліся першыя два цыклы. Звычаі, абрады, магічныя прыёмы, звязаныя з родамі і дзеяннямі бабы-павітухі, зніклі поўнасцю; ва ўсіх жанчын роды прымаюць акушэркі і ўрачы ў спецыялізаваных аддзяленнях, колькасць разнастайных вераванняў, што суправаджалі цяжарнасць жанчыны, значна скарацілася. Найбольш устойлівымі ў часе аказаліся павер'і і забароны, заснаваныя на шматгадовых народных назіраннях і накіраваныя на засцярогу цяжарнай ад спалоху, разнастайных фізічных і псіхічных траўмаў (не глядзець на пажар, на пачвар, не падымаць цяжкага, сцерагчыся ўдараў і падзенняў). Працягваюць выконвацца пэўнай катэгорыяй сельскага насельніцтва звычаі і забароны, накіраваныя на забеспячэнне паспяховага зыходу родаў (не пераступаюць праз вяроўку, не сядзець на ганку, не выкручваць бялізну). Некалькі менш жывучымі аказаліся вераванні, якія, паводле народнага меркавання, садзейнічалі фарміраванню станоўчых рыс дзіцяці (забарона цяжарнай хлусіць, красці, сварыцца і інш.).

У пасляродавым цыкле працягваюць бытаваць звычаі і абрады наведвання парадзіхі і нованароджанага, першых крокаў дзіцяці і інш. Яны захоўваюць у першую чаргу традыцыйныя элементы гуманістычнага характару, якія і ў нашы дні дапамагаюць людзям з годнасцю адзначыць нараджэнне новага чалавека, падтрымліваць сяброўскія, сваяцкія і суседскія адносіны. Новай рысай згаданых звычаяў і абрадаў можна лічыць уключэнне ў сферу іх дзеяння прадстаўнікоў працоўных калектываў. Разам з тым узніклі і нездаровыя тэндэнцыі, якія праяўляюцца ў празмерным павелічэнні падарункаў для парадзіхі і нованароджанага, у імкненні пампезна адзначыць хрэсьбіны.

Царкоўныя формы радзіннай абраднасці беларусаў: хрышчэнне дзіцяці і ачышчэнне ("увод") парадзіхі з дзіцем пасля родаў – былі ў гады савецкай улады афіцыйна забаронены, але працягвалі бытаваць у сельскай і гарадской

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

мясцовасці Беларусі, асабліва хрышчэнне дзіцяці. У апошнія гады, як толькі з'явілася такая магчымасць, рэзка павялічылася колькасць людзей, што ўдзельнічаюць у царкоўным абрадзе хрышчэння дзіцяці. Зараз вырашэнне пытання хрысціць або не хрысціць дзіця залежыць ад жадання бацькоў.

Такім чынам, традыцыйная радзінная абраднасць, якая стваралася на працягу вякоў, у пачатку XX ст. на тэрыторыі Беларусі ўяўляла сабой складаную культурна-гістарычную з'яву, што адпавядала заканамернасцям сацыяльна-гістарычнага развіцця і этнічным традыцыям. Яна з'яўлялася арганічнай часткай народнага быту, сямейнага ўкладу, светаўспрымання, што і прывяло да наяўнасці ў радзінных звычаях і абрадах разнастайных уяўленняў і поглядаў – магічных, рацыянальных, царкоўна-хрысціянскіх.

Пры тым ладзе жыцця, якім жыло беларускае сялянства ў пачатку XX ст., радзінныя звычаі і абрады займалі вельмі важнае месца, бо дзіця ў сям'і было будучым кармільцам бацькоў у старасці, адсюль такі клопат аб ім з першага дня нараджэння.

Радзінныя звычаі і абрады беларусаў, рускіх, украінцаў па змесце, структуры і характары праяўлення ў многім аднатыпныя. Рысы падабенства ў радзіннай абраднасці ўсходнеславянскіх і іншых народаў тлумачацца суседскімі тэрытарыяльнымі кантактамі і бяруць пачатак у глыбокай старажытнасці.

На сучасным этапе лёс традыцыйных духоўных каштоўнасцей, у тым ліку радзінных звычаяў і абрадаў, залежыць ад палітыкі ў галіне культуры. Калі грамадства захоча вярнуць свае нацыянальныя каштоўнасці і будзе імкнуцца да гэтага, то дасягне адпаведных вынікаў, а калі не, то яны знікнуць назаўсёды.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

1. *Грамадскі* быт і культура гарадскога насельніцтва Беларусі / В.К.Бандарчык, В.М.Балявіна, С.А.Мілючэнкаў і інш.; АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мн., 1990.

2. *Грамадскі* быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі / В.К.Бандарчык, Л.І.Мінько, Г.І.Каспяровіч і інш.;

АН Беларусі. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мн., 1992.

3. *Зеленин Д.К.* Восточнославянская этнография. – М., 1991.

4. *Липень Я.П.* Современные семейные обряды в духовной жизни народа: Автореф. дис. … канд. ист. наук. – Мн., 1990.

5. *Крук І.І.* Сімволіка беларускай народнай культуры. – 2-е выд. – Мн., 2003.

6. *Кухаронак Т.І.* Радзінныя звычаі і абрады беларусаў: канец XIX – пачатак XX стст. – Мн., 1993.

7. *Ракавал В.* Быт и культура городской молодежи. – Мн., 1989.

*В.Ю.Вітвіцкая*

## ГУЛЬНЯ Ў ФАРМІРАВАННІ КУЛЬТУРЫ АСОБЫ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асоба з’яўляецца асноўным носьбітам культуры. Усе больш буйныя культурныя аб’яднанні (культура грамадства, нацыі, регіёну і інш.) з’яўляюцца вытворнымі ад культуры асобы. Пры гэтым лёгка зразумець, што па меры павелічэння аб’ёму культуры ўзрастае ступень яе ўнутранай разнастайнасці, а пры навуковым яе разглядзе ўзмацняецца ступень абстрактнасці асноўных паняццяў і каштоўнасцей. Інакш кажучы, чым большае кола асоб уваходзіць у дадзенае культурнае аб’яднанне, тым менш цэльным з’яўляецца гэтае аб’яднанне і тым больш умоўны характар маюць вылучаемыя ў ім уласцівасці.

Аднак у сваёй гістарычнай аснове культура выступае ў ролі грамадскай з’явы, і асоба так ці інакш уступае ў пэўныя зносіны з рознымі сацыякультурнымі структурамі. Пры гэтым заканамернасць гістарычнага развіцця культуры заключаецца ў тым, што з цягам часу культура асобы пачынае адыгрываць усё больш важную ролю і ўсё больш індывідуалізуецца. Так, калі на пачатку культурнага развіцця чалавецтва для ўсіх членаў пэўнага супольніцтва (роду, племені, сям’і і інш.) існавала прыблізна адна і тая ж сістэма каштоўнасцей, то для навейшага часу такое становішча про-